УДК 636.4.082.2:631

У. К. САЎЧАНКА, У. В. ГОРЫН, Т. І. ЯПІШКА

СТРУКТУРА АСАЦЫЯТЫЎНЫХ СУВЯЗЕЙ ГАСПАДАРЧА КАРЫСНЫХ ПРЫКМЕТ СВІНЕЙ

У практычнай селекцыі пастаянна існуе неабходнасць комплекснай ацэнкі зыходнага матэрыялу. Падыход да арганізма як да цэлага з'яўляецца адной з важнейшых праблем біялогіі. Аднак існуючыя метады колькаснай генетыкі не прадугледжваюць цэласнай ацэнкі арганізма. Ідэя цэласнасці атрымала далейшае развіццё ў канцэпцыі асацыятыўнага адбору [1—5], згодна з якой у якасці элементарнай адзінкі адбору разглядаецца не ізаляваная прыкмета, а арганізм як цэлае, што дазваляе зрабіць прадметам вывучэння спалучаны комплекс асацыіраваных прыкмет. Для яго ацэнкі прапанаваны новы паказчык — рэзультуючы параметр.

Гэты параметр разлічваецца на аснове неканапічнага ўраўнення множнай рэгрэсіі і ўяўляе сабой лінейную камбінацыю адбіткаў кожнай